# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ПЯТНІЦА
6 лістапада
1992 года
№ 19
(1684)


ШТО ГАВОРЫЦЬ...

## МІНІСТР АДУКАЦЫІ ВІКТАР ГАЙСЁНАК

...ПРА ПАГРОЗУ АДУКАЦЫІ, ЯКУЮ НЯСЕ ПЕРАХОД ДА РЫНАЧНЫХ АДНОСІН.

Адукацыя — сістэма вельмі інерцыйная, якую даволі цяжка парушыць. Але калі не спыніць працэс разбурэння ў сферы матэрыяльна-тэхнічнага, навуковага і тэхнічнага забеспячэння, то ён нанясе непапраўную шкоду. У той жа момант пераход да рыначных адносін дае магчымасць развіцця адукацыі ў новых эканамічных умовах. Таму трэба асэнсаваць гэтыя ўмовы і зрабіць так, каб адукацыйны механізм працаваў, абапіраючыся на новыя рэаліі, і перспектыўна акрэсліць развіццё адукацыі ў краіне. Праграма развіцця адукацыі Рэспублікі Беларусь падрыхтавана міністэрствам і неўзабаве будзе вынесена на абмеркаванне ўрада.

...ПРА НЕАДКЛАДНЫЯ МЕРЫ ПА СПЫНЕННІ ПРАЦЭСУ МАТЭРЫЯЛЬНАГА РАЗБУРЭННЯ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ

Зараз жыццёва неабходна істотнае павышэнне аб'ёму фінансавання адукацыі. Закон аб адукацыі прадугледжвае, што мы павінны мець 10 працэнтаў ад нацыянальнага даходу. Мы падлічылі, што маем сёння каля 6 працэнтаў.

Мы лічым, што неабходна ўвесці дзяржаўны заказ на капітальнае будаўніцтва аб'ектаў адукацыі, бо яно апошнім часам рэзка скарацілася.

Сёння востра стаіць пытанне аб прыцягненні вытворчага патэнцыялу для абслугоўвання патрэб адукацыі праз льготы ў падаткаабкладанні і крэдытаванні, аб стварэнні вытворчай інфраструктуры адукацыі. Гэтай інфраструктуры ў нас не існуе: усё ад кавалка крэйды да прабіркі зараз праблема.

Неўзабаве міністэрства ўнясе ў Саўмін свае прапановы па стварэнні рэспубліканскага і рэгіянальных фондаў развіцця адукацыі, каб прыцягваць пазабюджэтныя сродкі.

...ПРА СТРУКТУРНУЮ ПЕРАБУДОВУ АДУКАЦЫІ

Адукацыйная сістэма павінна быць шматузроўневай і шматварыянтнай на кожным узроўні.

...ПРА ЎЛАДКАВАННЕ НА РАБОТУ ВЫПУСКНІКОЎ ВНУ

Тая наменклатура спецыяльнасцей, па якой рыхтавалі ВНУ студэнтаў, сёння задаволіць не можа, бо па некаторых спецыяльнасцях, асабліва ў тэхнічнай сферы, відавочная «перавытворчасць», а па некаторых, наадварот, кадраў не хапае: па эканоміцы, бухгалтарскім уліку, фінансаванні, юрыспрудэнцыі, асобных гуманітарных напрамках. На гэта і будуць скіраваны структурныя змены, якія міністэрства мяркуе правесці ўжо ў гэтым навучальным годзе.

Дапаможа вырашыць праблему і ўвядзенне сістэмы двухузроўневай падрыхтоўкі: на першай ступені студэнт атрымлівае базавую адукацыю, на якой, як на падмурку, можна правесці спецыялізацыю ў любым напрамку, што дазволіць хутка рэагаваць на патрэбы рынку, рыхтаваць кадры па спецыяльнасцях, у якіх будзе патрэба. Гэта дасць магчымасць пры неабходнасці перакваліфікавацца. Пераход на двухузроўневую сістэму падрыхтоўкі міністэрства будзе стымуляваць, але не прымушаць да яго. Кожная ВНУ сама будзе вырашаць, калі гэта трэба зрабіць.

ГЭТА ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ

## ПАЧЫМ ДЫПЛОМ?

У кругавароце цэн універсітэт, як бачна, таксама не паспявае, таму ў новым загадзе рэктара ад 15 кастрычніка «Аб увядзенні платы за паўторнае навучанне студэнтаў, за перавод студэнтаў ва універсітэт з іншых навучальных устаноў, з факультэта на факультэт і аб павелічэнні платы за выдачу дублікатаў і архіўных даведак», адным з пунктаў папярэджваецца, што плата за ўсё пералічанае можа быць зменена пры агульным змяненні цэн. Што хутчэй відавочна, чым неверагодна. Так што, калі маеце намеры падпасці пад катэгорыю. аб якой вядзецца размова ў загадзе, спяшайцеся пакуль...

За паўторнае навучанне студэнтаў, адноўленых пасля адлічэння або не засвоіўшых вучэбны план за курс без уважлівых на тое прычын, здымаецца «хабар» на карысць універсітэта 25 тысяч рублёў за навучальны год на дзённай форме навучання, 15 тысяч — на вячэрняй і 10 тысяч — на завочнай.

Калі ж пашчасціць аднавіцца на наступны курс, то за кожную запазычанасць (усё роўна, экзамен ці залік) давядзецца ўносіць па 500 рублёў на ўсіх формах навучання.

Можна перавесціся ва універсітэт з іншых навучальных устаноў без страты курса за 5, 4, 3 тысячы рублёў адпаведна на дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання, а са стратай курса навучання — дадаткова па 25, 15 і 10 тысяч рублёў за кожны страчаны курс адпаведна на дзённай, вячэрняй альбо завочнай формах навучання.

Дарэчы, перавод з вячэрняй або завочнай формаў навучання на дзённую каштуе цяпер 12,5 тысяч рублёў, з факультэта на факультэт без страты курса 12,5 тысяч, 7,5 тысяч і 5 тысяч рублёў на розных формах навучання, а са стратай — яшчэ па 25 тысяч, 15 тысяч і 10 тысяч за кожны страчаны курс.

Асаблівыя абставіны даюць рэктарату права ў некаторых выпадках вызваліць студэнтаў ад аплаты.

Не пазайздросціш цяпер і няўдачнікам, якія губляюць то дыплом, то студэнцкі білет, то заліковую кніжку. Калі здарыцца, небарака апынецца без аднаго, другога і трэцяга, ён жа за гэта павінен будзе і плаціць — 1000 рублёў. Архіўная даведка асобам, якія ад'язджаюць за мяжу, абыдзецца ім у два разы танней.

Ну а каму прыйдзе ў галаву замест звычайнага «пагнацца» за дыпломам замежнага ўзору, падрыхтуйце, калі ласка, 1500 рублёў.

Такое наша жыццё...

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

## УСЕ НА ЗАБАСТОЎКУ!?

Калі тыдзень-другі будзе пуставаць працоўнае месца звычайнага рабочага ці калгасніка без вышэйшай адукацыі і чырвонага дыплома — эканоміка панясе адчувальныя страты, што не застанецца безуважным для нас з вамі праз некалькі дзён ці месяцаў.

У адносінах да настаўнікаў сярэдніх школ і выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў нават няёмка і слова такое ўжываць — «забастоўка».

— Звычайнае гультайства,— зазначыць рабочы.

— Безумоўна,— падтакне яму абывацель.

І абодва, калі меркаваць па відавочнай колькасці «паднятай на-гара» прадукцыі, будуць мець рацыю.

Ці можна абвінавачваць звычайных людзей за іх недальнабачнасць? Іншая справа — урад. Для яго і дзесяць крокаў наперад — кароткая дыстанцыя.

Калі тыдзень-другі будзе пуставаць месца за школьнай партай, а тым больш у інстытуцкай аўдыторыі, дзеці рабочага і калгасніка адчуюць на сябе цяжар праблем, створаных недальнабачнасцю сённяшняга ўрада.

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*

ЧЫРВОНЫ РАДОК

*Як звычайна, не спыняюцца замежныя камандзіроўкі выкалдчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.*

*1 лістапада накіраваўся ў нямецкі горад Бохум дацэнт кафедры матэматычных метадаў тэорыі кіравання механіка-матэматычнага факультэта Сяргей Васільевіч РАГОЗІН для навуковай работы ў рамках міжвузаўскага супрацоўніцтва паміж БДУ і Рурскім універсітэтам.*

*У той жа дзень пачалася камандзіроўка ў Вялікабрытанію асістэнта кафедры мікрабіялогіі біялагічнага факультэта Аляксандра Георгіевіча ПЕСНЯКЕВІЧА. Ён будзе ўдзельнічаць у правядзенні сумесных даследванняў у Шатландскім інстытуце харчавання, па запрашэнню супрацоўніка гэтага інстытута доктара І. Д. Лайна.*

*Для ўдзелу ў X юбілейнай выставе-кірмашы геалагічных мінералаў, якая адбудзецца ў польскім горадзе Саснавец, а таксама для вырашэння пытанняў супрацоўніцтва паміж геаграфічным факультэтам нашага універсітэта і факультэтам геаграфіі і рэгіянальных даследванняў Варшаўскага універсітэта днямі накіруюцца ў Польшчу намеснік прарэктара, начальнік НДЧ Анатоль Пятровіч ГРЫШАНОВІЧ і супрацоўнікі геаграфічнага факультэта: дэкан факультэта прафесар Расціслаў Афанасьевіч ЖМОЙДЗЯК, загадчыца музея агульнага землязнаўства Крысціна Мікалаеўна РАМАНЕНКА, старшы лабарант гэтага музея Валянціна Лявонцьеўна СМАЛЯКОВА і вядучы інжынер НДЛ геаграфічнага факультэта Сяргей Анатольевіч ЮДАЕЎ.*

ПАПЯРЭДЖАННЕ

## ЗАСТАЛІСЯ ЖЫЦЬ, АЛЕ БЕЗ ДЫПЛОМАЎ

Нікога, здаецца, сёння ўжо не здзівіш п'янкамі ў інтэрнатах. І п'янкі гэтыя вельмі падобныя адна на адну. Збяруцца студэнты адзначыць нейкую падзею альбо проста так «пагудзець», і працягваецца гэта да таго часу, пакуль большая частка кампаніі ўжо не можа ні піць, ні курыць, а толькі марыць аб тым, каб хутчэй дзе-небудзь прылегчы. Вось тут і пачынаюцца чорныя справы «зялёнага змія» ў сяброўстве з «чырвоным пеўнем».

Нядаўні пажар у інтэрнаце па вуліцы Сурнагава, 37, корпус 5 усхваляваў усю Беларускую політэхнічную акадэмію. Перадгісторыя гэтай падзеі такая. Да сірыйскага студэнта прыйшлі яго сябры, студэнты энергафака. Усё, як і трэба быць: спачатку нагода — амаль скончылі вучобу ў акадэміі, вось-вось атрымаюць дыпломы, і — бывай, студэнцкае жыццё. Дзесьці каля трох гадзін уначы суседзі адчулі пах гарэлага. Ліха нарабіў пакінуты на канапе акурак. Дзякуй Богу, што на гэты момант у пакоі нікога не было і не здарылася трагедыі, якая адбылася ў інтэрнаце інстытута культуры, дзе загінуў у полымі адзін з сабутэльнікаў.

Можна сказаць, што студэнтам у дадзеным выпадку пашчасціла. Калі не ўлічваць таго, што двое з іх пакінуць сцены акадэміі без дыплома.

**М. БАКУНОВІЧ,**
старшы інжынер
пажарнай часткі па ахове
Маскоўскага раёна.

ШТО НОВАГА?

## КАР'ЕРА ПАЧЫНАЕЦЦА

*Нават першакурснікі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта маюць магчымасць паклапаціцца аб сваёй працоўнай будучыні. Трэба толькі запоўніць адпаведныя анкеты. А задача лакальнага камітэта Міжнароднай асацыяцыі студэнтаў, якія вывучаюць эканоміку і менеджмент,— занесці дадзеныя для зацікаўленых у студэнтах эканамічных спецыяльнасцей фірм.*

*Прэзідэнт гэтага камітэта Мікалай Пучкоў, студэнт другога курса фінансава-эканамічнага факультэта, паведаміў, што 17 снежня запланавана правесці сустрэчу студэнтаў і прадстаўнікоў фірм, на якой адбудзецца абмен інфармацыяй, а дзень 17 снежня назваць «Днём кар'еры». Для студэнтаў, якімі зацікавяцца фірмы, ён можа стаць сапраўды пачаткам кар'еры, бо яны будуць вучыцца і працаваць у фірме, якая робіць на іх стаўку.*

САКРЭТ ФІРМЫ

## КІТАЙЦЫ ПАНЯВОЛІ

Не спадабаўся Кітай студэнтам і стажорам Навасібірскага дзяржаўнага ўніверсітэта. А «засланы» яны былі ў Пекін аж у 1988 годзе.

Стыпендыя — 180 долараў ЗША (1000 юаней) у месяц. Па кітайскіх падліках амаль хапае на жыццё. Чым толькі не падраблялі студэнты: і мовы выкладалі, і цыгарэтамі спекулявалі, і рэйсы Пекін — Навасібірск учынялі. І нават здымаліся ў кітайскіх фільмах (атрымлівалі 100 юаней).

Словам, неяк перабіліся да зімы 1991—1992 года, калі былі арыштаваны валютныя рахункі Знешэканомбанка, а з імі і долары, якія заплаціла дзяржава.

Некалькі месяцаў студэнты наогул не атрымлівалі стыпендыі, пакуль іх не перавялі на кітайскую — 320 юаней (дзеля зноснага харчавання трэба не менш 400 юаней у месяц). Самыя ўдачлівыя працавалі афіцыянтамі, перакладчыкамі, спявалі пад гітару ў метро. А некаторыя прадавалі апошнія штаны.

Хто выжыў — атрымаў кітайскі дыплом. Які, дарэчы, не прызнаецца ў СНД.

## ПЕРАКУЛІМ ПА СТАПАРЫКУ?

Працаздольнасць студэнтаў у прамую залежыць ад наяўнасці ў ВНУ уласнага... рэстарана. Менавіта да такой высновы прыйшлі, пэўна, у МДУ, адкрываючы «Хай бар». Яго супрацоўнікі, дарэчы, не плацяць нават ламанага граша за арэнду памяшкання за тое, што будуць абслугоўваць студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта на ільготных умовах. А частка прыбыткаў будзе накіроўвацца таксама і на развіццё універсітэта.

«Хай бар» вядомы як сумеснае прадпрыемства з афганцамі, але цяпер галоўная роля належыць сонечнаму Ірану. Так што і асартымент у асноўным усходні.

Алкагольных напіткаў у меню няма, што не перашкаджае ім быць у наяўнасці. Заплаціць за абед прыкладна палову стыпендыі здольны не кожны — большасць студэнтаў па-ранейшаму харчуюцца ў сталоўцы. Але галоўнае — гонар за свой універсітэт, у якім ёсць усё. Нават рэстаран.

**ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ**



# УСЕ НА ЗАБАСТОЎКУ!?

*Фота С. Палешука.*




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

Даўно выйшлі на сцяжынку вайны пакрыўджаныя ненамернымі перагрузкамі і мізэрнымі грашовымі падачкамі настаўнікі.

А 29 кастрычніка адбыўся нечарговы IV пленум Рэспубліканскага камітэта прафсаюзаў работнікаў адукацыі і навукі Беларусі, які прыняў пастанову з патрабаваннем да Саўміна Беларусі неадкладна ўвесці ў поўным аб'ёме артыкул 34 Закона аб адукацыі і адпаведны зварот да Вярхоўнага Савета рэспублікі.

30 кастрычніка прагучаў заклік да аб'яўлення перадзабастовачнага становішча.

**Дык ці будуць баставаць педагогі?**

**Адказвае старшыня прафсаюзнага камітэта Анатоль Васільевіч ПАЎЛАЎ:**

**— А ў вас не выклікае абурэнне паведамленне пра тое, што на верасень 1992 года сярэднямесячная зарплата рабочых і служачых на прамысловых прадпрыемствах склала 7,013 тысяч рублёў, а ў педагагічных работнікаў, якія валодаюць самым каштоўным «таварам» — інтэлектам, толькі 3 тысячы 640 рублёў? Так што атмасфера гранічна напружаная. У выпадку невыканання патрабавання прафсаюзаў вырашана весці работу па падрыхтоўцы забастоўкі і вызначыць тэрмін канферэнцыі, якая тайным галасаваннем адкажа на пытанне: пачынаць забастоўку ці ўстрымацца ад калектыўных дзеянняў барацьбы за свае правы.**

***— Як ставяцца да гэтай прапановы работнікі універсітэта?***

**— Меркаванні падзяляюцца. Гуманітарыі, якія жывуць фактычна на адну зарплату, галасуюць «за», на прыродазнаўчых факультэтах, дзе пакуль выратоўваюць гаспадарча-дагаворныя работы, вагаюцца. На самай справе — быццё вызначае свядомасць.**

**Спрацоўвае і стэрэатып боязі — усё ж такі не прызвычаіліся мы яшчэ да таго, што правы свае трэба адстойваць такімі радыкальнымі мерамі. Хоць і давялі нас да крайнасці.**

**Многіх палохае вызначэнне — бестэрміновая забастоўка. Адразу ж пытаюцца пра зарплату. Прафсаюзы вышэйшай школы, зразумела, не ў стане падтрымліваць фінансамі бастуючых выкладчыкаў. Сродкаў не хопіць нават на 2 дні. Акрамя таго, існуе і польскі варыянт: з'яўляцца на працоўныя месцы і не працаваць.**

**У любым выпадку я як старшыня прафсаюзнага камітэта буду адстойваць інтарэсы нашых супрацоўнікаў да канца.**

З. МАРАВА.

## СВЕДЧАЦЬ САЦЫЁЛАГІ

# ПРАЗ ЦЯЖАР МІНУЛАГА ШЛЯХУ

***Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў (НІСЭПД) — недзяржаўная, некамерцыйная арганізацыя, створаная як альтэрнатыва афіцыйнай сацыяльнай навуцы. Дэвіз Інстытута — «Дэмакратыя і рынак», а галоўная мэта — з дапамогай вывучэння сацыяльна-эканамічных і палітычных механізмаў пераходу ад таталітарызму да дэмакратыі стымуляваць развіццё новых суб'ектаў палітыкі і эканомікі і тым самым садзейнічаць фарміраванню ў Беларусі грамадзянскага грамадства. Плануецца, што Інстытут будзе займацца навукова-даследчай, экспертнай, кансультацыйнай, інфармацыйнай, выдавецкай і вучэбна-адукацыйнай дзейнасцю.***

***Старшынёй праўлення Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследванняў з'яўляецца доктар сацыялагічных навук Алег МАНАЕЎ, выканаўчым дырэктарам — Аляксандр ДАБРАВОЛЬСКІ.***

***Першыя буйныя даследванні, з якіх пачынае сваю дзейнасць НІСЭПД, прысвечаны вывучэнню ролі сродкаў масавай інфармацыі ў працэсе пераходу ад таталітарызму да дэмакратыі; вывучэнню фінансавых рынкаў і рабочага руху ў рэспубліцы; вывучэнню развіцця беларускага этнасу ў пераходны перыяд.***

***Даследчым праектам «Новыя суб'екты палітыкі і эканомікі Беларусі» кіруе кандыдат фізіка-матэматычных навук Ю. ДРАКАХРУСТ. Прапануем вашай увазе фрагменты з падрыхтаванага ім аналітычнага даклада «Грамадская свядомасць і новыя суб'екты палітыкі Беларусі», якія складзены на аснове вынікаў сацыялагічнага апытання насельніцтва Беларусі, праведзенага НІСЭПД у красавіку-маі бягучага года.***

Важнай характарыстыкай беларускага грамадства, якую выявіла даследванне, з'яўляецца супярэчлівасць, разарванасць грамадскай свядомасці. Новыя каштоўнасці, сацыяльныя ролі і ўяўленні суіснуюць у грамадстве, а часам у адных і тых жа людзей, з рэліктамі мінулага і з прамежкавымі, пераходнымі формамі. Такая супярэчлівасць уласцівая любому грамадству, якое знаходзіцца ў пераходным стане.

У ходзе аналізу вынікаў апытання мы сутыкнуліся з заканамернасцямі, якія даўно вядомы сацыёлагам, журналістам і ўсім, хто займаецца грамадскімі праблемамі: людзі старога ўзросту больш прыхільныя да традыцыйных каштоўнасцей, таксама і вясковыя жыхары.

Мы не задаволіліся такой трывіяльнай канстатацыяй і сфармавалі ў выбарачнай сукупнасці 4 групы: «прыватнікі» (рэспандэнты, якія ўдзельнічалі хаця б у адной форме прыватнай эканомікі), «актывісты» (рэспандэнты, якія ўдзельнічалі хаця б у адной форме грамадзянскага публічнага дзеяння), «дэмакраты» (тыя з апытаных, хто сімпатызаваў хаця б адной некамуністычнай партыі ці руху ў рэспубліцы або Свабоднаму Прафсаюзу Беларусі), «камуністы» (тыя з апытаных, хто станоўча ставіцца да Партыі Камуністаў Беларусі ці да Руху за Дэмакратыю, Сацыяльны Прагрэс і Справядлівасць). Розніца ў меркаваннях паміж гэтымі групамі больш значная, на наш погляд, чым традыцыйныя адрозненні паміж узроставымі групамі.

Адносіны «дэмакратаў» і «камуністаў» да ўсяго спектру праблем істотна адрозніваюцца. Разам з тым, сувязь паміж перакананнямі апытаных і іх палітычнай пазіцыяй не вельмі цесная. Так, сярод «камуністаў» 58,7 працэнта з'яўляюцца і «дэмакратамі», г. зн. сімпатызуюць хаця б адной некамуністычнай партыі або руху ў рэспубліцы. Сярод дэмакратаў людзей з такімі ж шырокімі поглядамі 29 працэнтаў. Такія вялікія перакрыжаванні сведчаць аб тым, што працэс фарміравання палітычнага грамадзянскага грамадства і шматпартыйнасці знаходзіцца ў нас у самым пачатку. І справа тут не столькі ў асаблівасцях саміх партый, колькі ў стане грамадскай свядомасці.

На пытанне «Ці лічыце вы неабходным аднаўленне СССР?» станоўча адказалі 47,9 працэнта апытаных, адмоўна — 22 працэнты, вагаліся 29,5, а наогул не адказалі на гэта пытанне 0,6 працэнта рэспандэнтаў. Заўважым, што сярод чатырох даследаваных груп толькі «камуністы» адчуваюць да СССР больш цёплыя пачуцці, чым насельніцтва ў цэлым (сярод іх 68,7 працэнта адказалі станоўча на гэта пытанне). І «дэмакраты», і «актывісты», і «прыватнікі» ў меншай ступені, чым насельніцтва ў цэлым, хацелі б аднаўлення СССР (сярод «дэмакратаў» прыхільнікаў гэтага 42,9 працэнта, сярод «актывістаў» — 40,6, сярод «прыватнікаў» — 39,5).

Трэба звярнуць увагу на тое, што грамадская думка ў гэтым пытанні адрозніваецца ўстойлівасцю: толькі 9,4 працэнта з тых апытаных, хто 17 сакавіка 1991 года прагаласаваў за Саюз, зараз змянілі свой пункт гледжання, а 9,8 працэнта з тых, хто прагаласаваў супраць СССР, сёння хацелі б яго аднаўлення.

З другога боку, толькі 10 працэнтаў рэспандэнтаў згадзіліся з тым, каб уласнасцю ў Беларусі мелі права валодаць грамадзяне іншых краін СНД. Гэтая лічба нават меншая, чым працэнт тых, хто гатовы прадаставіць права ўласнасці ў Беларусі грамадзянам з «далёкага замежжа» (13,6 працэнта). Пэўна, маецца на ўвазе, што разам з апошнімі прыйдуць у рэспубліку і замежныя інвестыцыі. Так цэнасная ўстаноўка на аднаўленне СССР спалучаецца на практычным узроўні з нежаданнем дзяліцца ўласнасцю рэспублікі з сабратамі па былым Саюзе.

Адказы на пытанне «Ці патрэбны новыя выбары ў Вярхоўны Савет Беларусі?» размеркаваліся наступным чынам: 33,8 працэнта рэспандэнтаў — прыхільнікі перавыбараў, 15,1 працэнта супраць іх, вагаліся 46,4 працэнта, не адказалі 4,8. Сярод «актывістаў» доля прыхільнікаў новых выбараў складае 40,8 працэнта; сярод «прыватнікаў» — 43 працэнты; сярод «дэмакратаў» — 44 працэнты; сярод «камуністаў» — 29,6.

Ці трэба аднавіць ролю кампартыі ў нашым грамадстве? На гэта пытанне анкеты атрымана 14,3 працэнта станоўчых і 49,3 адмоўных адказаў. Ваганні перашкодзілі адказаць 35,7 працэнта апытаных, наогул праігнаравалі гэта пытанне 0,7 працэнта з іх. 39,1 працэнта «камуністаў» не пярэчылі б супраць аднаўлення ролі сваіх любімцаў, «актывісты» адзіныя ў думцы за народам у цэлым (14,7 працэнта), толькі 9,3 працэнта «прыватнікаў» жадалі б вяртання змагароў з прыватнай уласнасцю, і 10,6 працэнта «дэмакратаў» прытрымліваюцца падобнага меркавання.

Важныя вынікі дае вывучэнне адказаў на пытанне, якая з грамадска-палітычных груп з'яўляецца для апытаных найбольш непрыемнай. Для 68,8 працэнта рэспандэнтаў — неафашысты, для 56 працэнтаў — нацыяналісты, для 54,1 — прадстаўнікі сексуальных меншасцяў, для 46,3 — сталіністы, для 39,9 — сіяністы, для 33,4 — камуністы, для 30,9 — манархісты, для 16,1 — прадпрымальнікі, для 16 працэнтаў — дэмакраты і для 12,6 — сацыялісты.

Своеасаблівым індыкатарам талерантнасці з'яўляюцца адказы на наступнае пытанне: «Ці належыць дазваляць прадстаўнікам непрыемных вам груп любыя публічныя дзеянні, якія звязаны з насіллем?» Станоўча адказалі 12,3 працэнта апытаных; адмоўна — 29 працэнтаў; лічаць, што трэба падыходзіць выбарча, — 28,3 працэнта рэспандэнтаў; праігнаравалі гэта пытанне 29,7 працэнта. Гэтыя вынікі сведчаць аб тым, што талерантнасць — не самая распаўсюджаная якасць у нашым грамадстве. Сярод «дэмакратаў» 27 працэнтаў лічаць, што непрыемным для іх людзям нельга дазваляць публічныя дзеянні, сярод «прыватнікаў» аналагічнай думкі прытрымліваюцца 33,8 працэнта апытаных, сярод «камуністаў» — 29,1, сярод «актывістаў» — 32,3.

З кім удзельнікі апытання звязваюць надзеі на выхад Беларусі з крызісу? 34 працэнты — з урадам рэспублікі, 31,3 працэнта — з замежным капіталам, 29 працэнтаў — з беларускімі прадпрымальнікамі, 16 працэнтаў — з кіраўнікамі дзяржпрадпрыемстваў, 14,2 працэнта — з Вярхоўным Саветам; на армію і КДБ спадзяюцца 8,6 працэнта рэспандэнтаў, на палітычныя партыі — 5,5 працэнта, на судовую сістэму — 4,8 працэнта, са сродкамі масавай інфармацыі — 2,7 працэнта.

Больш чым палова апытаных — 54,1 працэнта — аддаюць перавагу рыначнай эканоміцы, 42,2 працэнта — планавай, астатнія 3,7 працэнта не выказаліся па гэтаму пытанню. Анкета прапанавала рэспандэнтам зрабіць яшчэ адзін выбар — аддаць перавагу невысокай зарплаце на гарантаванай рабоце або высокаму заробку з рызыкай работу згубіць. У другога варыянта знайшлося больш прыхільнікаў — 49,1 працэнта апытаных. 48,1 працэнта задаволіліся б невысокім заробкам пры ўмове гарантыраванага месца, 2,8 працэнта свайго выбару не абвясцілі.

У дадзеным выпадку мы сутыкаемся з феноменам, які ўжо адзначаны ў многіх сацыялагічных даследваннях: ідэя, выказаная абстрактна, выклікае больш сімпатый, чым тыя ці іншыя вынікі яе рэалізацыі. Змены ў сферы ідэй адбыліся такія значныя, што нават кожны другі «камуніст» аддае перавагу рыначнай эканоміцы. 68,1 працэнта апытаных аддалі б перавагу дастатку тавараў па высокіх цэнах, а 28,7 працэнта рэспандэнтаў больш спакойным здаецца становішча з пастаянным дэфіцытам пры нізкіх цэнах. 3,2 працэнта свае перавагі ў гэтым раздзеле анкеты пакінулі для сябе.

Істотна змянілася грамадская свядомасць у адносінах да прыватызацыі ў параўнанні з недалёкім мінулым. Асабліва наглядна гэта можна бачыць на прыкладзе адносін да прыватызацыі ў сельскай гаспадарцы. Лічаць, што неабходна прыватызаваць у сельскай гаспадарцы ўсё, 28 працэнтаў апытаных; на частковую прыватызацыю згаджаюцца 30,3 працэнта; недапушчальным выглядае гэты працэс для 26,3 працэнта рэспандэнтаў; цяжка было адказаць на такое пытанне 37,2 працэнта з іх; не адказалі наогул 4,3 працэнта.

Інакш размеркаваліся галасы ў адказе на пытанне аб прыватызацыі ў буйной прамысловасці. Згодны на яе поўную прыватызацыю толькі 7,8 працэнта ўдзельнікаў анкетавання, на частковую — 24,4; лічаць прыватызацыю ў буйной прамысловасці недапушчальнай 26,3 працэнта; прызналіся ў складанасці гэтага пытання 37,2 працэнта; «не заўважылі» яго 4,3.

44 працэнты «дэмакратаў» лічаць, што буйную прамысловасць трэба прыватызаваць цалкам або часткова, сярод «камуністаў», «актывістаў» і «прыватнікаў» доля іх аднадумцаў складае адпаведна 31,7, 34 і 33 працэнты.

Можна сказаць, што беларускае грамадства змяняецца і засвойвае пры гэтым каштоўнасці і ўяўленні, якія ўласцівы ўсё ж дэмакратычнаму грамадству з рыначнай эканомікай. Прычым гэтыя каштоўнасці і ўяўленні засвойваюцца праз сацыяльную практыку людзей, якая змянілася і працягвае змяняцца.

Аднак рысы, характэрныя для таталітарнага менталітэту, бачна прысутнічаюць у беларускім грамадстве. Менавіта ў грамадстве, а не толькі сярод прадстаўнікоў улады. Як бачым, многія рэспандэнты мелі цяжкасці з адказамі на пытанні, актуальныя як для ўсяго грамадства, так і для іх асабіста.

Розныя сацыяльныя групы і нават сферы свядомасці адных і тых жа людзей змяняюцца нераўнамерна. Гэтым і тлумачыцца супярэчлівасць грамадскай свядомасці. Таму і фарміраванне сацыяльных груп з усвядомленымі інтарэсамі, і фарміраванне і ўспрыманне цэласных ідэйных комплексаў ідзе дастаткова марудна. А менавіта гэта з'яўляецца асновай для фарміравання шматпартыйнасці і развітога палітычнага грамадзянскага грамадства.

Дарога, па якой ідзе беларускае грамадства, вельмі звілістая. Але дарога, якой бы доўгай яна ні была, пачынаецца з першых крокаў. І падарожнік, што крочыць па ёй, нясе на сабе цяжар усяго пройдзенага шляху.

НЕВЕРАГОДНА!

# МАСТАЦТВА ВЯРТАЕ ДА ЖЫЦЦЯ

Георгій Несцераў — зноў выстава.

Някідкія вобразы хаты ля ракі і той далечы, дзе ўсё губляе абрысы. Дарэчы — знішчэнне дакладных абрысаў на гэтых палотнах без рамак — хіба гэта фармальна? Не, свядома. «Каб вока пераходзіла без перашкод ад адной карціны да наступных»,— так адказаў Несцераў на пытанні пра рамкі. Наватарства? Філасофія жывапісу.

«Я працую з памяццю. Гэтым абумоўліваецца ступень яснасці, дакладнасці выяў на карцінах, ступень іх набліжанасці ці, наадварот, аддаленасці»,— казаў Несцераў. Ён — майстра ілюзіі, майстра мроі. Майстра ведае таямніцу. «Вашы карціны гояць. Зноў і зноў прыходжу на вашу выставу...»— напісаў у кнізе адозваў глядач пад час экспанавання карцін у Маскве.

Шлях мастака да тэмы прыроды ішоў праз фантасмагорыі, заглыбленасць у падсвядомае першых карцін. Пераходным этапам былі нацюрморты, якія прывялі ўласна да ўсведамлення боскай сутнасці прыроды. «Створанай Богам»,— скажа ён у інтэрв'ю Беларускаму тэлебачанню. Несцераў — гэта адметнасць. На шэрані сцен яго карціны пульсуюць кроплямі сціснутай праўды, квінтэсенцыяй пачуцця. У мастакоў бывае талент перадачы нейкага новага стану — жывапіс робіцца містэрыяй, ён здольны прывесці чалавека ў адпаведны сугучны стан, перадаць гледачу нешта новае, новае адчуванне сусвету — здаецца, гэта магчыма і тут, на гэтай выставе, калі мы наогул не страцілі чуйнасць.

Здаецца, ён малюе ауру свету — дрэў, травы, лужын, вільгаць паветра. Гэта ўсё настолькі адзінае, непадзельнае — гэта Імгненне і вечнасць у імгненні, гэта сапраўды філасофія цуду ў прыродзе, гэта мастацтва. Наогул, я не ведаю, што гэта. Проста гэта трэба ЎБАЧЫЦЬ.

Несцераў малюе лакам, праўда, выкарыстоўвае і масла, але яго празрыстыя, лёгкія мазкі, іх рытміка і няўлоўнасць даюць адчуванне руху прасторы. Аура жыве і струменіць, і вы бачыце нешта жывое, чаму не знойдзеш назвы.

Піфагор калісьці сказаў: «Свет падобны на кірмаш: адны прыходзяць сюды гандляваць, другія — сябе паказаць, а самыя шчаслівыя прыходзяць сюды глядзець...» Можа, шанц мастака — паказаць нам тое, што мы абмінулі і страцілі? Мы забываемся, што жыццё — гэта шчасце, зямля — гэта шчасце, што фарбы травы ізумрудна-зялёныя, што яны гояць душу. Гэта — выйсце з зацятага кола змагання ў вечнасць.

Аднойчы пасля экзамену па палітычных партыях выкладчыца раздумліва сказала студэнтам: «Здаецца, навошта нам тая палітыка? Учора працавала на дачы і думала: тут усё ёсць — і зямля, і работа, і сэнс...»

Мы ўсе жывем так: страцілі адзінства са светам і сталі бязважкімі, без трывалай апоры. Аб гэтым ведаем, але жывем... Кажуць, ёсць мастакі, ёсць іх творы, што могуць вярнуць да жыцця. Прычашчэнне жыццём — нейкай напаўсвядомай магчымасцю цуду. Яны вас паміраць з жыццём. Трэба толькі паверыць. Так мала — паверыць мастацтву.

Н. ЖУК.

ШТО БЫЛО!

# ПАКУЛЬ У ФІЗБОЙ ГУЛЯЮЦЬ ЛІЦЭІСТЫ

***Як і многія цікавыя падзеі, усё пачалося з дробязі. Ішоў сабе па вуліцы малы з надуўнымі шарыкамі, адзін з якіх чамусьці вельмі не хацеў паднімацца, а другі апускацца. «Трэба ў гэтым разабрацца»,— падумалі нераўнадушныя фізікі Мінскай сярэдняй спецыяльнай школы пры БДУ. Аб'ектамі першых даследванняў былі то надуўны шарык, то цвік і драўляная дошка, і пайшло, і пайшло... Вынікі такіх даследванняў прадстаўлялі на фізбаях, якія сталі сапраўднай школай для нашых выпускнікоў.***

Што ж гэта такое — фізбой?

Вынайшлі яго супрацоўнікі фізічнага факультэта МДУ, на чале з Я. М. Юносавым. А ў гэтым годзе ў Маскве адбыўся ўжо V Міжнародны турнір.

Заданні турніру для каманды з 5—10 чалавек вядомыя загадзя (прыкладна за паўгода) і ўяўляюць сабой праблемы, якія патрабуюць сур'ёзнага тэарэтычнага і, як правіла, эксперыментальнага даследвання. Трэба дадаць, што падобна на большасць праблем «дарослай» фізікі, дакладнага рашэння гэтыя заданні не маюць.

Для каманды гэта напружаная, карпатлівая работа на працягу некалькіх месяцаў, якая развівае навыкі фізіка-даследчыка. І калі алімпіяду можна параўнаць са спрынтэрскім бегам, дзе неабходна ўменне «схопліваць» ідэю і хутка, без памылак індывідуальна яе рэалізоўваць, то турнір — камандны марафон, які патрабуе стабільнасці і вынослівасці. Аднак працяглы тэрмін падрыхтоўкі ніякім чынам не характарызуе яго, як конкурс «чарапашак». Папершае, гэтага патрабуе ўзровень заданняў і глыбіня падрыхтоўкі дакладаў, а па-другое, на працягу турніру дастаткова сітуацый, калі ад удзельнікаў патрабуюцца «спрынтэрскія» якасці: уменне імгненна зарыентавацца, «схапіць» сутнасць пытання.

Адна з каманд робіць даклад, а дзве іншыя яго абмяркоўваюць, фактычна выконваючы функцыі апанента і рэцэнзента. За ходам дзеяння назірае журы. Затым каманды мяняюцца ролямі. Пераможца выходзіць у наступны круг.

У адрозненне ад алімпіяды, дзе размаўляць забаронена, тут забаронена адваротнае. Узаеміны — гэта абавязковая атмасфера турніру: як унутры каманды, так і паміж камандамі яны ў наяўнасці дваццаць гадзін у суткі. (Пры гэтым, падлеткі развіваюць сваю мову, бо журы і апанент фіксуюць усё сказанае і напісанае, вучацца слухаць выступаючага, карэктна весці дыскусіі, уменню фармуляваць пытанні і даваць вычарпальныя адказы). Практычна — гэта абарона маленькай дысертацыі.

У 1991 годзе на ўсесаюзным турніры ў Адэсе Беларусь была прадстаўлена двума камандамі, сфарміраванымі з вучняў ліцэя пры БДУ. Нашы прадстаўнікі, якія тады ўпершыню трапілі на турнір такога ўзроўню, занялі 12-е і 13-е месцы (з 20 удзельнікаў). Набылі вопыт і цвёрдае жаданне сустрэцца ў наступным годзе.

Сёлета каманда ліцэя ў складзе Максіма Зайцава (капітан), Сяргея Кацава, Аляксандра Бернштэйна, Міхаіла Хусіда, Дзмітрыя Чыгрына, Аляксандра Клімовіча і Рамана Лознікава на турніры СНД заняла III месца, прапусціўшы наперад каманды МДУ і Адэсы (што падзялілі першае месца) і Ноўгарада (II месца), заваявала пуцёўку на V Міжнародны турнір. Гэта быў, што называецца, «апошні бой» выпускнікоў ліцэя 1992 года, таму падрыхтоўка да яго была самай сур'ёзнай. Нам дапамагала ўся школа, на чале з адміністрацыяй.

На міжнародныя спаборніцтвы сабраліся 12 каманд, а таксама назіральнікі з Якуціі. З «далёкага замежжа» прыехалі традыцыйна моцныя каманды Галандыі, Венгрыі, Чэха-Славакіі, Польшчы, акрамя таго, вядомыя нам каманды з Расіі (Масква, Ноўгарад), Малдовы, Грузіі, Украіны, Казахстана. Турнір праходзіў у Серпухаве, побач з сусветнавядомым паскаральнікам элементарных часцінак.

У першым баі жарабя звяло нас з камандамі Венгрыі (пераможцай мінулага года) і Украіны (Адэсы). Дакладваў Міхаіл Хусід, усёй камандай апаніравалі і рэцэнзавалі. З боку выглядала нядрэнна. Журы прысудзіла нам другое месца, Венгрыі — першае, Украіне — трэцяе. А ноччу каманда рыхтавалася да важнага бою з МДУ і Малдовай. Адступаць нам не было куды. Гэта разумелі ўсе. Дакладчыкам воляй лёсу зноў быў Міхаіл Хусід. Мы перамаглі! Каманды МДУ і Малдовы падзялілі другое месца. Перамога ў выпадку ўдалага (для нас) ходу турніру давала шанц выйсці ў фінал.

Вельмі цяжкі быў бой з камандамі Галандыі і Чэха-Славакіі. Добрае аснашчэнне галандцаў (пераносны камп'ютэр, спараны з партатыўным графапраектарам), высокая эрудыцыя і цудоўная англійская мова чэхаў абяцалі высокі напал паядынку. Так яно і выйшла. Ад нас дакладваў капітан каманды Максім Зайцаў. Усе да аднаго ўдзельнікі бою да апошняй хвіліны не маглі сказаць, хто пераможа. Марудна, вельмі марудна рука лічыльніка выводзіла на дошцы пераможныя лічбы! Мы апярэдзілі галандцаў на 0,5 бала (з 60 магчымых)! Цяпер толькі адзін пераможны бой аддзяляў нас ад фіналу.

Наступны тур мы гулялі з Ноўгарадам і Польшчай. Вучні адчувалі «сваю» гульню. Яны былі карэктныя, несшматслоўныя, праяўлялі рыцарскія якасці (нарэшце пазбавіліся ад старых памылак). Журы было аднадушна: Беларусь — I месца, Ноўгарад — II, Польшча — III. Мы ў фінале! Прамоўцам у гэтым баі быў Сяргей Кацаў, чый даклад вельмі спадабаўся журы.

Фінальны тур сабраў лепшых па рэйтынгу — Беларусь, Галандыю, МДУ, Чэха-Славакію. Рэдкі выпадак 4-каманднага фізбою! Падрыхтоўка да яго працягвалася да трох гадзін раніцы. Мы так праглі перамогі, тым больш, што нашыя лепшыя даклады яшчэ не «сыгралі». Самае галоўнае, што ў вучняў «гарэлі» вочы, у нас з'явіліся свае балельшчыкі, якія не выйшлі на фінішную прамую. Усе чакалі фіналу.

Жарабя зрабіла нас дакладчыкамі ў першым дзеянні. Гэта выгадна, калі ў вас засталіся моцныя даклады. У адваротным выпадку... у нас былі, шчыра кажучы, не толькі выдатныя нарыхтоўкі. Мы чакалі заказу зборнай Чэха-Славакіі. Па ўмовах турніру можна адмовіцца толькі два разы. Капітан чэхаў зрабіў заказ на вельмі аб'ёмную задачу. Апаніраваць па ёй лягчэй, чым дакладваць. Але мы прадугледзелі і такі варыянт. Максім (капітан каманды) зрабіў паўзу і... адмовіўся. Наступны заказ — тое, што нам трэба! Мы прымаем выклік. Развесілі плакаты, падрыхтавалі дэманстрацыі, раздалі членам журы дадатковыя матэрыялы. Дакладвалі Максім Зайцаў і Сяргей Кацаў. Дэманстрацыі праводзілі Дзмітрый Чыгрын і Аляксандр Клімовіч. 20 хвілін (працавалі з перакладчыкам) праляцелі імгненна. Пасля заканчэння даклада ўсё суцішылася. Гэта бывае ў двух выпадках: альбо занадта добра, альбо вельмі дрэнна. Мы чакалі ацэнак, не дыхаючы. Што б там ні здарылася — хлопцы малайцы, яўных памылак дапушчана не было. Але... За выключэннем дзвюх пяцёрак, усе ацэнкі былі вышэйшымі — 5+. Цяпер усё залежыла ад узроўню дакладаў астатніх каманд. Дагнаць нас будзе няпроста. А раптам? Галоўнае цяпер — не разгубіць пазіцыі пры апаніраванні і рэцэнзаванні. І з гэтай апошняй задачай наша каманда справілася. Яшчэ да афіцыйных ацэнак я палічыў балы і ўпершыню не паверыў калькулятару — мы першыя! Калі аб'явілі вынікі фіналу, зала дружна апладзіравала ўсім удзельнікам гэтага выдатнага дзеяння. Мы дабраліся да вяршыні ТЮФа і абверглі прагнозы скептыкаў, і апраўдалі надзеі ўсіх, хто нам дапамагаў, хто хваляваўся за нас дома. Мы прымалі віншаванні з перамогай, а самі яшчэ не верылі ў яе.

Мы везлі дадому дыплом I ступені, два дыпломы за лепшы даклад турніру, і было крыху сумна ад таго, што ўсё засталося ўжо ззаду...

**Леанід МАРКОВІЧ,**
**асістэнт кафедры методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі.**

ДЛЯ ПРАСТАКОЎ

# СЦЕРАЖЫСЯ ПАДМАНУ!

**«Перш чым аддаваць любімае дзіця ў новую недзяржаўную вучэбную ўстанову, даведайцеся, ці мае яна ліцэнзію на выкладчыцкую дзейнасць. Калі ж такой няма — задумайцеся»,— папярэджвае штотыднёвік «Поиск» і прапануе звяртацца за парадай да спецыялістаў. Каб не атрымалася так, як на Украіне.**

**У адзін дзень былі адлічаны студэнты Украінскага свабоднага інстытута менеджменту і бізнесу. Усе адразу. Без тлумачэння прычын, без уліку паспяховасці вучобы. Вось так. А быў час, калі гэтая незалежная ВНУ была ўрачыста адкрыта на Івана-Франкоўшчыне. Праіснавала толькі год.**

**Незалежныя эксперты, якія пабывалі на месцы здарэння па просьбе засмучаных студэнтаў і іх бацькоў, высветлілі, што ВНУ... не была ВНУ ні па падбору кадраў, ні па вучэбных праграмах. Модная шыльдачка сабрала многа студэнтаў, якім абяцалі «лёгкі і цікавы вучэбны працэс», а значыць, і «лёгкі дыплом».**

СЛУЖБА 03

# КАЛІ НЕПАКОЯЦЬ ЗУБЫ

**Маленькая дзірачка ў зубе прыносіць вялізную боязь перад зубным урачом. Гэта пачуццё знаёма практычна кожнаму. Гэта боязь можа стаць небяспечнай, калі пастаянна адкладваць наведванне ўрача. Хворы зуб часта бывае прычынай галаўнога болю і нават розных рэўматычных хвароб.**

**Карыес у наш час — адна з самых распаўсюджаных хвароб. Жудасна тое, што нават сярод шасцігадовых дзяцей мала хто мае бездакорныя зубы. Таму такой неабходнай з'яўляецца прафілактыка зубных захворванняў.**

**Пачніце з харчавання. Перавагу трэба аддаць вырабам з мукі грубага памолу, прадуктам, якія змяшчаюць бялок, свежай садавіне і гародніне. А вось белы хлеб і цукар — сапраўдная атрута, калі адразу пасля ежы не пачысціць зубы. Салодкія вырабы садзейнічаюць размнажэнню бактэрый, якія ўтвараюць у роце асаблівыя кіслоты, што застаюцца на сценках зубоў і раз'ядаюць зубную эмаль. Калі вы не сябруеце з гігіенай поласці рота, дык і зубны ўрач вам не дапаможа. Чысціць зубы трэба не менш чым тры разы ў дзень па тры хвіліны: пасля снядання, пасля абеда і перад сном. Але ўрача таксама наведваць рэгулярна. Пры выкананні гэтых умоў вам пашчасціць пазбегнуць захворвання, якое можа прывесці да поўнай страты зубоў,— парадантыту.**

**Прырода не падорыць вам асляпляльна прыгожыя зубы, калі вы самі не дапаможаце ёй зрабіць іх такімі.**

**Г. ГАЛЬЧАНЮК.**
**урач.**

Я МЯРКУЮ

# ШТО ТАКОЕ ГУМАНІТАРЫЗАЦЫЯ?

***Кожны з нас разумее гэта па-свойму. І мае права на ўласны пункт гледжання. Сёння яго выказвае студэнтка факультэта журналістыкі Наталля ЖУК.***

Сярод іншых праблем існуе ў нашым жыцці праблема якасці навучання. Дакладней — карыснасці ведаў, якімі запаўняюць галовы студэнтаў. Мы крочым да гуманітарызацыі. Магчыма таму на лекцыях па гуманітарных дысцыплінах нам часта выкладаюць адразу па некалькі поглядаў на адну і тую ж праблему: мы супастаўляем меркаванні Маркса, Вебера, Леніна... Атрымліваецца страката, затое аб'ёмна. Але ж гэта безнадзейна — высвятляць, хто з іх бліжэй да праўды. Калі тлумачэнняў так многа, можна абрацць аналагетам аднаго і сцвярджаць, што астатнія памыляліся. Ці ж магчыма дапусціць, што праўду казалі ўсе адразу? Хіба стасуюцца адзін да аднаго погляды Леніна, Плеханава, Бакуніна і Дастаеўскага? І наогул, што рабіць бедным студэнтам, калі ЎСЕ гістарычныя асобы мелі думкі адметныя? Нашы лекцыі — як калейдаскоп. Ці не час зразумець, што сістэмы думак, самыя складаныя, не здольныя перадаць усю праўду? Гэты вэрхал ідэй, супярэчлівых думак нараджае нейкую інтэлектуальную перанасычанасць «ведамі» і адчужанасць думкі ад рэальнасці. І недавер да слоў. Бо калі факт быў адзін, а тлумачэнняў зашмат, дык чаго вартыя гэтыя гіпотэзы?

Тады мае аднакурснікі пачынаюцьісці сваім ходам, і тэорыі множацца ў геаметрычнай прагрэсіі. Што ні галава — са сваёй тэорыяй. Ці мае сэнс такая гуманітарызацыя, якая памнажае колькасць слоўных канструкцый, тым змяншаючы шанц разабрацца?

Кажуць, раней вывучалі тэорыю, каб пераканаць апанента. А цяпер? Сёння яго ўжо не пераканаеш чыёйсьці цытатай — хаця прагучала так многа слоў, што хопіць, каб збіць з панталыку ўсіх апанентаў свету. Чалавек проста не прымае ЧУЖОЕ. Таму студэнту на заліку лепш адказваць, памятаючы лекцыі выкладчыка, — ён жа часцей за ўсё прымае сваю, самаскладзеную форму доказаў, свае назіранні над рэчаіснасцю.

Дык у чым тады сэнс атрымання адукацыі? У накапленні таго, што відавочна не спатрэбіцца ў жыцці? Што ж, чалавек наогул істота загадкавая. Ён так часта робіць тое, чаго рабіць не трэба. І трэба зразумець ШТО...

# СТУДЫЁН

## СПАРТАКІЯДА 92-93

### Сенсацыя?!

Гэтым годам Кубак першых курсаў праходзіў на стадыёне «Дынама» і ўпершыню працягваўся некалькі дзён (з 7 па 10 кастрычніка). Халоднае надвор'е не садзейнічала бегунам, і высокіх вынікаў ніхто не паказаў. Затое была добрая арганізацыя Кубка і актыўны ўдзел студэнтаў. Амаль усе першакурснікі, за выключэннем хворых, выйшлі на першыя студэнцкія старты.

Што датычыцца вынікаў, то першае месца заняла каманда механіка-матэматычнага факультэта. У пяцёрку мацнейшых таксама ўвайшлі: ФЭФ, геафак, журфак, біяфак.

Сёлета парушана даўняя традыцыя гэтых спаборніцтваў. Раней пераможцамі былі: ці то невялікі факультэт (дзе лягчэй арганізаваць першакурснікаў да ўдзелу), ці то ФПМ. Дык што, мехмат стварыў сенсацыю? Відаць, не — Проста сур'ёзна паставіўшыся да кроса, ён заканамерна падняўся на вышэйшую прыступку.

### Геафак быў мацнейшым

На стадыёне ў Шчамыслiцы адбыўся турнір па мініфутболу ў рамках універсітэцкай Спартакіяды. Няма сэнсу запэўніваць, што футбол (і ў выглядзе міні таксама) з'яўляецца, бадай, самым папулярным відам спорту. Таму на кожным факультэце можна сабраць моцную каманду. калі не пусціць справу на самацёк.

І турнір прайшоў удала. Упартая барацьба назіралася амаль у кожнай сустрэчы. Таму не дзіўна. што размеркаванне выніковых месцаў было адкладзена да апошняй сустрэчы. А калі яна скончылася, то давялося нават улічваць розніцу забітых і прапушчаных мячоў, бо некаторыя каманды мелі роўную колькасць набраных ачкоў. У рэшце рэшт, чацьвёрка лепшых каманд выглядае наступным чынам: геафак, мехмат, факультэт прыкладной матэматыкі і журфак.

Географы аказаліся крыху мацнейшымі.

### На чэмпіёнскі тытул — чатыры прэтэндэнты

Тым часам працягваюцца валейбольныя спаборніцтвы сярод юнакоў. Прайшлі пакуль папярэднія старты ў падгрупах. Па дзве лепшыя каманды ўвайшлі ў фінальную чацьвёрку. Гэта: мехмат, геафак, радыёфізікі і юрысты. У аднакругавым турніры яны выявяць пераможцу. Лепшыя шанцы на сённяшні дзень маюць матэматыкі і юрысты, у актыве якіх ужо ёсць па ачку за перамогі над географамі і радыёфізікамі ў папярэдніх спаборніцтвах. Але галоўная барацьба яшчэ наперадзе. Як адзначылі адказныя работнікі, што праводзяць турнір, каманды паказваюць высокі ўзровень валейбола, не маючы ў сваіх саставах «зорак». Балельшчыкам гэта даспадобы.

**А. ЮРЫН.**

## «ЗОРНЫЯ» СПОВЕДЗІ

# РАЗАМ МЫ — СІЛА

**Ёсць у спорце імёны, якія ведае кожны з нас. Адно з іх — Уладзіслаў Трацццяк, праслаўлены хакейны варатар Завяршыўшы спартыўную кар'еру, Уладзіслаў напісаў кнігу «І лёд, і полымя». У ёй — не толькі малавядомыя звесткі жыцця Трацццяка, але і шмат цікавага пра хакейную зборную СССР...**

Перад апошняй гульнёй сусветнага першынства 1983 года ў Мюнхене адбылося тое, аб чым даўно марылі некаторыя кіраўнікі Міжнароднай хакейнай лігі, якія далі жыццё новай формуле розыгрыша чэмпіяната. Нагадаем яе: мацнейшая чацьвёрка павінна ў аднакругавым фінальным турніры весці спрэчку за «золата», прычым ачкі, атрыманыя камандамі напярэдадні, не ўлічваюцца. Навошта прыдумалі такія змены? Яны хацелі падставіць падножку савецкай зборнай, спадзеючыся, што ў фінале хто-небудзь з сапернікаў здолее адваяваць у нас хаця б адно ачко, і тады...

Так і адбылося. Каманда ЧССР, якая згубіла ў папярэднім турніры пяць ачкоў, з усяе моцы накінулася на нас і... 1:1. Тая самая нічыя, якая для нас пагражае абярнуцца паражэннем.

У Маскве балельшчыкі будуць пытацца ў мяне, ці мог я ў той гульні не прапусціць тую адзіную шайбу? Не, не мог! Гэта было звыш маіх сіл. Таму што шайба, кінутая Хрудзінай, закранула нашага абаронцу, і ад яго ўляцела ў вароты. Такія галы ні адзін варатар узяць не ў стане, гэта па-за магчымасцямі чалавечай рэакцыі. Балельшчыкі, зразумела, запытаюцца і пра тое, што перашкодзіла нам выйграць тую сустрэчу? Напэўна, нехта падумае, што мы недаацанілі сапернікаў пасля буйной перамогі над імі, атрыманай некалькімі днямі раней. Гэта не так. У фінале мы хутчэй пераацанілі зборную ЧССР, бо поспех у папярэдняй гульні загадзя рабіў нас чэмпіёнамі свету. Мы перастараліся.

І вось... Чэхаславацкая каманда выходзіць на лёд супраць шведаў. Затым матчам з канадцамі мы завяршаем сусветнае першынства. А бяда ў тым, што шведам усё роўна, як скончыцца іх апошняя сустрэча: яны вышэй чацьвёртага месца ўжо не паднімуцца. Яны могуць паставіць у вароты іншага варатара, могуць вывесці слабы састаў, могуць проста «здаць» гульню — для іх вынік не мае ніякага значэння. А вось іх супернікі наадварот зацікаўлены ў выйгрышу з вялікай перавагай, таму што лёс «золата», напэўна, вырашыць розніца шайбаў. Перамогуць чэхі з лікам 10:0, і тады нам прыйдзецца выйграваць у канадцаў не менш шасці шайбаў. Лёгка сказаць...

Вось такая арыфметыка. Наш лёс апынуўся ў руках іншых каманд.

...Я яшчэ раз памянуў нядобрым словам формулу першынства і яе вынаходнікаў. Раптам зазваніў тэлефон.

— Уладзіслаў, на прагулку, — гэта наш доктар Барыс Сапроненкаў.

У холе гатэля — тэлевізар. Амаль не спыняючыся, іду міма. Сустрэча ўжо пачалася, але балельшчыкамі нам зараз быць не трэба — навошта загадзя паліць нервовую энергію.

— Пакуль 0:0,— кажа Барыс.

0:0 — гэта добра. Цікава, колькі ўсё ж прапусцяць шведы?

Дзіўна, але на гэтым першынстве адносіны ў нас з імі неяк не складзіся. Ды і абедзьве гульні з імі не атрымаліся — яны былі нейкімі бурклівымі, некарэктнымі. Некалькі разоў іграні абедзвюх каманд заставаліся на лядовым полі ўтраіх, было шмат выдаленняў. Хлопцы баяцца, што шведы, каб адпомсціць нам. без бою «здадуць» сённяшні матч.

...Вось так — дыхаем, гуляем, а думкамі на лёдзе. Праз паўгадзіны вяртаемся ў гатэль. Што за цуд: першы перыяд скончыўся з лікам 0:0! Вось дык шведы! Малайцы! Настрой у нас адразу памяняўся.

Праз некаторы час паяўляецца Барыс. Ну і выглядае ён — твар белы-белы. Усе з месцаў паўскоквалі. «Шведы прайграюць — 0:4. Падобна на тое, што «сплаўляюць» гульню.

Калі і надалей так пойдзе, то... Здзейсніваліся нашы самыя горшыя асцярогі. Маўчком селі ў аўтобус. Паехалі ў «Алімпія-халле».

Дзіўна, думаў я, дзіўна, што мы нічога не можам зрабіць.

Мы прыйшлі ў сваю раздзявальню на 12-й хвіліне трэцяга перыяду. На трыбуну ніхто не падняўся — сіл не было на гэта глядзець. Сядзім. чакаем. Раптам ускоквае Слава Фяцісаў:

— Чаго насы павесілі? Колькі спатрэбіцца, столькі і заб'ем канадцам! Трэба пяць — закінем пяць, трэба дзесяць — будзе і дзесяць.

Адрантвенне прайшло. Сапраўды, навошта мы раней часу сябе хаваем? Канадцы — крэпкі арэшак, але ж чаму нас заўсёды вучылі трэнеры? Таму, што для сапраўднага спартсмена няма нічога немагчымага!

Канадскія хакеісты — цудоўныя майстры, амаль кожны з іх — зорка. Але сабраныя з розных клубаў. нязвыклыя выступаць за зборную, яны ўступаюць нам у такім важным кампаненце гульні, як калектывізм. памножаны на імкненне да перамогі.

А вось і перыяд скончыўся. Шведы, надзіва ўпарта супрацiўляліся. 1:4! Вынік — лепей і ўявіць немагчыма. Хакеісты «Трэ кунур» адгулялі сумленна.

Што робіцца ў нашай раздзявальні! Настрой такі, быццам мы ўжо сталі чэмпіёнамі свету.

Шведы ідуць міма нас. Ліндберг, варатар, гаворыць мне: «Я зрабіў больш, чым мог. Цяпер табе ўдачы...»

Потым мы перамаглі канадцаў з лікам 8:2.

Яшчэ адзін паядынак застаўся ззаду. Добра адчуваць сябе пераможцамі. Але намнога лепей, калі перамогу дабываў разам з сябрамі. Калі ўсе мы аднадумцы, калі мы моцныя не толькі ўменнем добра трымацца на каньках, але і сапраўдным мужчынскім сяброўствам — тады перад намі ніхто не ўстаіць.

## СПРЫНТ

### НА ГЭТАЙ АЛІМПІЯДЗЕ — ПЕРШЫЯ!

*Пераможцамі вярнуліся з Італіі шашысты зборнай Беларусі. Выступаючы самастойнай камандай, чны выйгралі Сусветную шашачную Алімпіяду. Гэта першы настолькі высокі поспех беларускіх спартсменаў пад час самастойнага выступлення. Анатоль Гантварг, Яўген Ватуцін і Аляксандр Прэсман — вось імёны нашых алімпійскіх чэмпіёнаў.*

### «ПАЛІТЭХНІК» ПАЙШОЎ ДАЛЕЙ

*Пераадолеў першы этап кубка УГФ па гандболу мінскі клуб «Палітэхнік». Па суме дзвюх сустрэч яны перайгралі каманду з Украіны — «Аўтамабіліст» з Бравароў. Дарэчы, украінскія гандбалісткі ў апошнія гады амаль заўсёды былі мацнейшыя ў спрэчцы з «Палітэхнікам». І вось надышоў час расплаты.*

### ДА ЛІДЭРА ВЕЛЬМІ ДАЛЁКА

*Набліжаецца заканчэнне першага круга першынства Беларусі па футболу. Яшчэ адзін тур і каманды разыдуцца на зімовыя вакацыі. Але ўжо сёння вядома, хто пакіне за сабой да вясны першае месца. Гэта, безумоўна, мінскае «Дынама». Дынамаўцы на сем ачкоў апярэдзілі клуб «Беларусь», які пакуль другі. Наўрад ці якая з каманд спадзяецца дагнаць лідэра. Затое барацьба за другое-трэцяе месца абяцае быць захапляючай. Прынамсі, на сённяшні дзень другую і восьмую каманды раздзяляюць толькі тры ачкі. Інтрыга будзе. А што нам, балельшчыкам, яшчэ трэба? Падрыхтаваў А. ЮРЫН.*

## ІНТЭРНЬЮС

### Новае пакаленне пачынае і... прайграе

**Такім чынам, дэбют мужчынскай валейбольнай зборнай Беларусі, нарэшце, адбыўся. 25 кастрычніка ў мінскім Палацы спорта нашы валейбалісты сустракаліся са зборнай Латвіі ў адборачнай гульні чэмпіяната Еўропы. Лік сустрэчы — 0:3.**

**Нашы супернікі — валейбалісты Латвіі прадстаўлялі адну каманду — рыжскі «Радыётэхнік», некалі адзін з самых тытулаваных клубаў Савецкага Саюза. Але іграні той каманды ўжо даўно выступаюць за межамі былога СССР. Таксама за мяжой сёння і лепшыя валейбалісты Беларусі (Гарбацюк, Алекна, Вярцелка, Краўцоў і інш.). Таму на пляцоўцы выступала пераважна адна моладзь. Як відаць, рыжская школа валейбола пакуль лепей за мінскую, нягледзячы на тое, што за зборную Беларусі выступаў адзін з «легіянераў» Ігар Загорцаў. Відавочна, адзін у полі не воін.**



### А жанчыны — малайцы!

**У той жа дзень, але толькі ў Таліне, свой першы міжнародны матч адборачнага цыклу еўрапейскага першынства правяла жаночая зборная Рэспублікі Беларусь. Даволі хутка і лёгка яна перайграла каманду Эстоніі — 3:0. Праўда, нельга пераацэньваць гэтую перамогу. Валейбол у Эстоніі не надта папулярны, таму і ўзровень яго адпаведны. Пра сапраўдную моц нашай каманды мы даведаемся пасля сустрэчы з больш моцным сапернікам. І ўсё роўна прыемна, што першы блін не комам.**

## ЧАМУ Б І НЕ МАРЫЦЬ?

**Мілан. «Баскетхалле». 10 тысяч гледачоў перапоўнілі яго трыбуны. Праз некалькі хвілін пачнецца сустрэча жаночага еўрапейскага баскетбольнага кубкавага турніру. Вось, нарэшце, з'яўляюцца гаспадыні пляцоўкі. Яны прадстаўляюць адзін з мацнейшых клубаў Еўропы. Адпаведна іх сустракае публіка: гром авацый, і мноства нацыянальных сцягаў. А вось выходзяць і супернікі — жаночая баскетбольная каманда... БДУ (Беларусь). Цёмнай кабылкай аказалася яна для італьянак. Ні інфармацыі пра яе, ні відэазапісу гульняў яны не змаглі атрымаць. Гульня пачалася...**

А цяпер спусцімся на зямлю і пагаворым пра справы ў баскетбольнай гаспадарцы нашай рэспублікі, Пачаўся чэмпіянат Беларусі па баскетболу сярод жанчын, удзел у якім прыняла і наша універсітэцкая каманда.

На першым этапе спаборніцтва восем каманд раскінуты на дзве падгрупы. Кампанію нашай камандзе складуць: СКІФ (Мінск), Гарызонт-2 (Мінск), МДПІ (Мінск). У другую падгрупу ўвайшлі: РВАР (Мінск), Тэхнолаг (Віцебск), Універсітэт (Гародня) і каманда з Гомеля. Пасля чатырохкругавога турніра па дзве мацнейшыя каманды выйдуць у фінал. Да іх далучыцца першая каманда «Гарызонта». Яны і разыграюць медалі паміж сабой.

Вось вынікі першага тура з удзелам каманды БДУ: СКІФ — 80:79, «Гарызонт-2» — 60:64, МДПІ — 87:82. Як бачым, у кожным паядынку была ўпартая барацьба. Двума перарывамі наша каманда падзяляе першае — трэцяе месца разам з «Гарызонтам-2» і СКІФам.

А тое, з чаго я пачаў заметку, мая невялічкая фантазія, якая зусім хутка можа стаць рэальнасцю. Калі каманда БДУ увойдзе ў прызавую тройку чэмпіяната (што па сілах нашым дзяўчатам). Бо кожнае прызавое месца гарантуе ўдзел у адным з еўрапейскіх клубных турніраў. І хто ведае, які супернік будзе ў нашай каманды. Праўда, удзел у падобных кубках справа неабавязковая, але навошта тады ўвогуле гуляць, калі не імкнуцца да самых высокіх вышынь. А што думае пра гэта галоўны трэнер каманды, даведаецеся ў наступным выпуску «Студыёна».

**А. ЮРЫН.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА

6 лістапада

Зак. 2198.

Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.